УДК [338.483.1:338.48-32]:001.895

# ІНАВАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ ЭКСКУРСІЙНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ Ў ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫМ ТУРЫЗМЕ

***І. Г. Лупашка,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Класічная экскурсія як турыстычная паслуга паранейшаму застаецца папулярнай, аднак ва ўмовах канкурэнцыі і новых патрабаванняў спажыўцоў турыстычнага прадукту паяўляюцца інавацыйныя формы экскурсійнага абслугоўвання. Разглядаюцца інавацыйныя формы экскурсійнага абслугоўвання (квэст-экскурсія, экскурсія-анімацыя, тэатралізаваная экскурсія, імерсіўная экскурсія, стэндап-экскурсія), вызначаюцца асаблівасці іх арганізацыі і методыкі правядзення. Адзначаецца, што ў распрацоўцы інавацыйных экскурсій задзейнічаны спецыялісты рознага профілю і выкарыстоўваюцца незвычайныя для традыцыйнай экскурсіі рэсурсы (прафесійныя акцёры, аніматары, музыканты і харэографы, тэатральны рэквізіт, мультымедыйныя сродкі і інш.).

**Ключавыя словы:** інавацыі, экскурсія, квэст-экскурсія, стэндап-экскурсія, імерсіўная экскурсія, экскурсія-анімацыя, тэатралізаваная экскурсія, гісторыка-культурны турызм, культурна-пазнавальны турызм, інтэрактыўнасць.

# INNOVATIVE FORMS OF EXCURSION SERVICES IN CULTURAL AND HISTORICAL TOURISM

***I. Lupashka,***
*PhD in Culturology, Associate Professor, Associate Professor of Historical and Cultural Heritage Department of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The classic excursion as a tourist service still remains popular, but in the conditions of competition and new demands from

consumers of the tourist product, innovative forms of excursion services are emerging. This article examines innovative forms of excursion services (quest excursions, animated excursions, theatrical excursions, immersive excursions, and stand-up excursions), highlighting the features of their organization and methodologies. It is noted that the development of innovative excursions involves specialists from various fields and utilizes atypical resources for traditional excursions (such as professional actors, animators, musicians, choreographers, theatrical props, multimedia tools, etc.).

**Keywords:** innovation, excursion, quest excursion, stand-up excursion, immersive excursion, animated excursion, theatrical excursion, cultural and historical tourism, cultural and educational tourism, interactivity.

Гісторыка-культурны патэнцыял краіны з'яўляецца асновай для развіцця аднаго з распаўсюджаных відаў турызму. Розныя аўтары і навуковыя школы вызначаюць яго як культурны, культурна-пазнавальны, гісторыка-культурны. Намі будзе выкарыстоўвацца азначэнне, прынятае ў адзіным класіфікатары відаў турызму ў Рэспубліцы Беларусь: «турыстычнае падарожжа з мэтай вывучэння гісторыі і культуры, а таксама дзейнайсць па яго арганізацыі» называецца гісторыка-культурным турызмам [3].

Асноўнай формай арганізацыі гісторыка-культурнага турызму з'яўляецца экскурсія. Класічная экскурсія па-ранейшаму застаецца папулярнай, аднак ва ўмовах канкурэнцыі і новых патрабаванняў спажыўцоў турыстычнага прадукту, узнікаюць новыя інавацыйныя формы экскурсійнага абслугоўвання.

Тэма інавацый у экскурсійнай дзейнасці і турызме наогул разглядаецца многімі замежнымі і айчыннымі даследчыкамі. Карыснымі для нашага даследавання былі працы Н. Аляксеевай, Т. Рабавай, Н. Савінай, Н. Фрыдолінай, Т. Хвагінай, М. Чырскага і інш. [1; 5; 6; 10; 11].

Мэта дадзенага артыкула – прааналізаваць інавацыйныя формы і метады правядзення экскурсій, выявіць іх асаблівасці. Пытанні тэхнічных інавацый у экскурсійнай дзейнасці з'яўляюцца прадметам асобнага даследавання і не разглядаюцца ў артыкуле.

Нельга не пагадзіцца з Т. Хвагінай, што сучасны сацыяльны запыт вылучае на першы план дасугавую функцыю экскурсіі. У сувязі з гэтым неабходна шукаць новыя арыгінальныя формы

інтэрпрэтацыі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны для таго, каб экскурсія адпавядала запытам спажыўцоў (з'яўлялася формай адпачынку), аднак, па магчымасці, захоўвала сваю ўніверсальнасць як форма передачы ведаў [11].

Інавацыйны падыход назіраецца ўжо пры адборы аб'ектаў экскурсійнага паказу, што звязана з пэўнымі зменамі турыстычнай цікавасці (дахі, сутарэнні, парадныя, камунальныя кватэры, містычныя месцы і месцы катастроф, папулярныя ў сацсетках месцы для фота і інш). Прывяздзем прыклады турыстычных прапаноў у розных краінах: «Пять парадных Сололаки» (Тбілісі, Грузія); «Выше крыши» і «Питер романтиков» (двары, парадныя, віды з дахаў), «Секреты ленинградских коммуналок» (Санкт-Пецярбург, Расія); «Легенды сталинских высоток», «Тени Москвы», «По следам московских привидений» (Масква, Расія); «Затерянные подземелья Томска» (Расія); «Прывід Лошыцкага парку» (Мінск, Беларусь), «Белая дама і Чорны манах у Гальшанах» (Беларусь). Нягледзячы на не класічныя аб'екты паказу, па зместу гэтыя экскурсіі можна класіфікаваць як тэматычныя.

*Містычныя экскурсіі,* як правіла, адбываюцца ў цёмны час сутак і ўключаюць элементы тэатралізацыі і анімацыі. Напрыклад, пешаходная экскурсія па Гродна «Тайны горада» вызначаецца яе стваральнікамі як «інтэрактыўная аўдыяэкскурсія ў фармаце тэатральнага прадстаўлення, дзе горад пераўтвараецца ў тэатральныя дэкарацыі і гучыць старымі легендамі» [8]. Экскурсія «Містычны Мінск» анансуецца як «аўтарская экскурсія-анімацыя, дзе адбудзецца знаёмства з горадам і яго містычнымі персанажамі» [4]. Больш класічны фармат мае экскурсія «Начная містэрыя. Дамініканцы Навагрудка», якая праводзіцца ў касцёле Святога Архангела Міхаіла і прадугледжвае знаёмства з храмам, спуск у крыпту, праслухоўванне аргана. Містычнасць экскурсіі надаюць змрок і свечкі, спецыяльнае адзенне і суправаджэнне манахам-дамініканцам [9].

Даволі часта сярод турыстычных прапаноў сустракаюцца экскурсіі з элементамі анімацыі і тэатралізацыі. У такім выпадку на адным з аб'ектаў класічнай экскурсіі адбываецца анімацыя ці міні-спектакль (дзяржаўная ўстанова «Лідскі гісторыка-мастацкі музей», установа «Музей «Замкавы комплекс «Мір», дзяржаўная гісторыка-культурная ўстанова «Музей Міхала Клеафаса Агінскага» (аг. Залессе) і інш.). Напрыклад, падчас экскурсіі ў Лідскім замку можна трапіць на вяселле Соф'і Гальшанскай і караля Ягайлы.

Адзначым, што ў сучасным экскурсазнаўстве яшчэ не выпрацавана адзіных падыходаў да размежавання паняццяў *экскурсія-анімацыя* і *тэатралізаваная эксурсія,* з-за чаго часам узнікае іх сінанімізацыя. Аўтар прытрымліваецца разумення, што анімацыя – гэта перш за ўсё забаўленне (гульня) [6, с. 14]. Анімацыйныя праграмы прадугледжваюць максімальную інтэрактыўнасць (актыўны ўдзел экскурсантаў).

Для тэатралізаванай экскурсіі (экскурсія-спектакль) характэрны адзіны мастацкі вобраз, створаны па законах драматургіі. З пункту гледжання методыкі арганізацыі тэатралізаванай экскурсіі важна падкрэсліць яе комплексны характар, паколькі спалучаюцца прыёмы экскурсійнай методыкі і сцэнарнарэжысёрскай працы. У экскурсіях часцей за ўсё выкарыстоўваюцца сцэнарная тэатралізацыя (тэатралізацыя падзей з жыцця рэальных людзей; падзей, якія маюць гістарычную значнасць; фактаў, дакументаў) і такія прыёмы, як персаніфікацыя, касцюміраванне, стварэнне гістарычнага фону і інш. [5]. Дэкарацыямі часта выступаюць музейныя інтэр'еры, тэрыторыі музеяў-сядзіб і музеяў-запаведнікаў, гістарычныя мясціны і інш.

Арганізацыя і правядзенне экскурсіі ў форме спектакля ці анімацыі з'яўляецца складаным і рэсурсазатратным працэсам. Таму экскурсій, якія прадугледжваюць такую праграму па ўсім маршруце, не так шмат. Некалькі экскурсій-анімацый прапануе турыстычная кампанія «Краіна замкаў». Экскурсія-анімацыя «Чорная нявеста пана Жлуктоўскага» адбываецца па даволі папулярным маршруце Іўе – Геранёны – Жамыслаўль – Гальшаны – Радзевічы. Аднак, у дадзеным выпадку, аб'екты агляду з'яўляюцца «гістарычнымі дэкарацыямі», на фоне якіх удзельнікі праграмы назіраюць чарадзейства, шукаюць рэліквіі, праходзяць квэсты, адгадваюць галаваломкі і інш., каб «вызваліць нявесту пана Жлуктоўскага ад чараў і цёмных сіл» [12]. Такія экскурсіі больш арыентаваны на эмацыянальныя ўражанні, чым на пазнанне.

Інтэрактыўна-забаўляльны фармат маюць і *імерсіўныя* (ад англ. immersive – «са стварэннем эфекту прысутнасці, пагружэння») экскурсіі. Большасць з іх адбываецца ў аўдыяфармаце з выкарыстаннем навушнікаў, без непасрэднай прысутнасці экскурсавода. Паколькі наяўнасць гіда – адна з асноўных прымет эскурсіі, то такі фармат слушна вызначаюць як імерсіўны праменад (прагулка). Звычайна, аўдыясуправаджэнне спалучае гістарычную даведку і аўдыяспектакль. Аднак існуюць варыянты, якія праду-

гледжваюць суправаджэнне экскурсавода-акцёра. У імерсіўных экскурсіях даволі часта выкарыстоўваецца такі метадычны прыём, як сторытэлінг (перадача інфармацыі праз распавяданні гісторый). Напрыклад, на імерсіўнай прагулцы «Спатканне з Тбілісі», знаёмства з гістарычным раёнам Салалакі адбываецца праз пагружэнне ў рамантычную гісторыю Георгія і Аніко – галоўных герояў спектакля. У гэтую канву ўпісаны і гісторыі вядомых жыхароў Салалакі: Пірасмані і Маргарыты, падарунак домаоперы Калантаравым і інш. Пра ўладкаванне грузінскага двара турысты даведваюцца праз дзіцячыя ўспаміны Георгія, дзе ўзнікаюць цётка Ніно, якая гатавала на балконе, дзядзька Сярго, па тэлевізары якога ўвесь двор глядзеў футбол, дзед Давід, якога ніхто не мог абыграць у шахматы. Аўдыяспектакль ілюструюць дзействам акцёры, якія суправаджаюць групу [8]. Такі забаўляльны фармат мае шмат прыхільнікаў. Аднак, ёсць і мінусы: нельга зрабіць прыпынак на маршруце для самастойнага агляду, задаць пытанні экскурсаводу, паглыбіцца ў тэму.

У музейнай дзейнасці ўжо даволі трывала замацаваліся *квэст-экскурсіі*. Зараз яны актыўна ўкараняюцца і ў турызме. Экскурсійны квэст спалучае ў сабе абавязковыя прыметы квэста і экскурсіі. Да экскурсійных патрабаванняў дадаюцца адметнасці, характэрныя для квэста: наяўнасць заданняў/перашкод; мэты, да якой можна прыйсці, пераадолеўшы перашкоды. Сярод экскурсійных прапаноў пераважаюць гарадскія пешаходныя квэсты, якія па змесце могуць быць як агляднымі, так і тэматычнымі. Па форме правядзення вылучаюць квэст-экскурсіі з непасрэдным удзелам экскурсавода і безасабовыя квэст-экскурсіі (квэст-маршруты, мабільныя квэсты). Безасабовыя квэсты фармальна не адпавядаюць паняццю «экскурсія», паколькі адсутнічае яе істотная прымета – наяўнасць экскурсавода [1]. Сярод беларускіх прапаноў – «Скарб Напалеона на Бярэзіне», квэст-экскурсія па Верхняму гораду, «Казкі Старога горада» і шэраг безасабовых квэстаў [2].

Не так даўно пачалі ўкараняцца экскурсіі, заснаваныя на персанальных інавацыях (стыль экскурсавода). У Маскве і Санкт-Пецярбургу турыстам прапаноўваюць наведаць *стэндап-экскурсіі* – пешаходныя гарадскія экскурсіі з экскурсаводам-стэндап-комікам. Маршруты і аб’екты паказу з’яўляюцца даволі класічнымі, аднак падача інфармацыі мае спецыфіку: анансуецца «паглыбленне ў гісторыю з гумарам» [13].

Адгукаючыся на запатрабаванні спажыўцоў, на рынку турыстычных паслуг поруч з класічнымі экскурсіямі ўзнікаюць інавацыйныя формы (квэст-экскурсія, стэндап-экскурсія, імерсіўная экскурсія, экскурсія-анімацыя, эскурсія-спектакль). Інавацыйная экскурсія, як правіла, з'яўляецца сінтэтычным прадуктам, у распрацоўцы якога задзейнічаны спецыялісты рознага профілю і выкарыстоўваюцца незвычайныя для традыцыйнай экскурсіі рэсурсы (прафесійныя акцёры, аніматары, музыканты і харэографы, тэатральны рэквізіт, мультымедыйныя сродкі і інш.).


*1. Алексеева, Н. Д.* Квест-экскурсия как инновационная форма экскурсионной деятельности / Н. Д. Алексеева, Е. В. Рябова // Вектор науки Тольяттинского государственного университета. Серия: Педагогика, психология. – 2015. – № 1 (20). – С. 14–17.

*2.* Квесты в Минске. – URL: https://experience.tripster.ru/experience/Minsk/15789-kvesty/?utm_source=google&utm_medium=cpc&utm_campaign=excursion_all_srch_dsa_url_all&utm_content=21413302022_Group-167674461287_Ad-704118054215&utm_term=&gad_source=1&gad_campaignid=21413302022&gclid=CjwKCAjwk43ABhBIEiwAvvMEB58K1B1zpbgPROkawlR7sCeMe0xTGUTdufFrL9yRfnpmxoLtsyC0mhoCknQQAvD_BwE (дата обращения: 27.03.2025).

*3.* О ведении Единой классификации видов туризма в Республике Беларусь : постановление М-ва спорта и туризма Респ. Беларусь от 7 авг. 2023 г. № 36 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22340307 (дата обращения: 03.04.2025).

*4.* Пешеходная экскурсия «Мистический Минск». – URL: https://travelagency.by/ekskursii/charodey-misticheskiy-minsk.html (дата обращения: 03.04.2025).

*5. Рябова, Т. В.* Театрализованная экскурсия в современных практиках социально-культурной анимации / Т. В. Рябова, Н. А. Фридолина // Вестник Санкт-Петербургского государственного института культуры. – 2020. – № 2 (43). – С. 104–108.

*6. Савина, Н. В.* Анимационная деятельность и сервис в туристической индустрии / Н. В. Савина ; Белорус. гос. экон. ун-т. – Минск : БГЭУ, 2020. – 351 с.

*7.* Свидание с Тбилиси: иммерсивная прогулка по Сололаки. – URL: https://experience.tripster.ru/experience/38895/?rubric=podezdy-i-paradnye (дата обращения: 27.03.2025).

*8.* Тайны города : [сайт]. – URL: https://tajnygoroda.by/ (дата обращения: 29.03.2025).

*9.* Тайны Новогрудка. – URL: https://merapi.by/tours/tayny-novogrudka/ (дата обращения: 27.03.2025).

*10. Хвагина, Т. А.* Инновации в экскурсионной деятельности / Т. А. Хвагина, Н. А. Чирский // Туризм и гостеприимство. – 2015. – № 2. – С. 20–27.

*11. Хвагина, Т. А.* Экскурсия в условиях современного туристического рынка Беларуси / Т. А. Хвагина // Туризм и гостеприимство. – 2014. – № 2. – С. 31–36.

*12.* Чорная нявеста пана Жлуктоўскага. – URL: https://zamak.by/product/nalibockaya_pushcha-2-3-3/ (дата обращения: 29.03.2025).

*13.* Stand Up. Экскурсия по Москве. – URL: https://standupmsk.com/standupwalk (дата обращения: 24.03.2025).